кам методыкі трэба вельмі адказна аднесціся да распрацоўкі праграм методыкі выкладання спецыяльных дысцыплін і можа нават рабіць гэта сумесна з кафедрай педагогікі і псіхалогіі.

Але каб гэты механізм запрацаваў на карысць студэнтаў, трэба на кожнай кафедры прызначыць лепшых выкладчыкаў, адказных за вытворчую і педагагічную практыку. Менавіта кіраўнік практыкі арганізоўвае эфектыўнае праходжанне практыкі, ажыццяўляе пастаянны кантроль за праходжаннем практыкі згодна вучэбнаму плану, ажыццяўляе праверку дзённікаў, праводзіць кансультацыі, аказвае неабходную дапамогу.

Трэба адзначыць, што наспела неабходнасць абмеркавання магчымасці арганізацыі базы практыкі ва універсітэце шляхам стварэння дзіцячых музычных, харэаграфічных студый, а таксама накіроўваць лепшых студэнтаў для праходжання вытворчай і педагагічнай практыкі ў мастацкія калектывы Беларускага універсітэта культуры. Думаю, што лепшыя студэнты V курса маглі б паспяхова праходзіць і педагагічную практыку са студэнтамі, напрыклад, I курса.

**А.А.Караткевіч,**
**ст. выкладчык Беларускага універсітэта культуры**

## АСНОЎНЫЯ ФОРМЫ ПРАКТЫКІ СТУДЭНТАЎ КАФЕДРЫ ДУХАВОЙ МУЗЫКІ

Важнейшым звяном у сістэме падрыхтоўкі кіраўнікоў духавых аркестраў і ансамбляў з'яўляецца вытворчая практыка. У ходзе яе студэнты набываюць практычныя навыкі работы з калектывам, развіваюць арганізатарскія, педагагічныя, творчыя здольнасці. Асабліва каштоўна, што ў час практыкі студэнты набываюць магчымасць прымяніць свае веды і ўменні як у кіраванні калектывам (развучванне твораў, правядзенне рэпетыцый, канцэртных выступленняў



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

і інш.), так і ў самастойнай працы па інструментоўцы, аранжыроўцы, працы над рэпертуарам, дзе яны пасцігаюць прынцыпы яго фарміравання. Важную ролю адыгрывае і назіранне за работай кіраўнікоў мастацкіх калектываў, спасціжэнне іх работы, арганізацыйных і творчых абавязкаў, што дапамагае студэнтам асэнсаваць усе цяжкасці, праблемы і асаблівасці будучай прафесіі. Менавіта таму вытворчая практыка на кафедры духавой музыкі праходзіць у вядомых калектывах, якія працуюць на працягу многіх гадоў, маюць дастатковы творчы і мастацкі ўзровень, цікавы рэпертуар, вядуць вялікую канцэртную дзейнасць, што адпавядае патрэбам і мэтам вытворчай практыкі.

Сярод такіх базавых калектываў народныя духавыя аркестры Палаца культуры трактарнага завода, студэнцкага клуба БДПА, студэнцкага клуба БДУРІ, камерны духавы аркестр школы-ліцэя пры БДАМ, аркестр духавых інструментаў "Няміга", узорна-паказальны аркестр УВ МУС РБ. Асабліва важна падкрэсліць выкарыстанне дзіцячых мастацкіх калектываў (узорны духавы аркестр ДМШ № 1, духавы аркестр мінскага Палаца дзяцей і моладзі). Гэтыя калектывы даюць магчымасць студэнтам спасцігнуць асаблівасці работы з дзецьмі, набыць веды і навыкі кіравання дзіцячым калектывам. Вядома, што патрэба ў кіраўніках калектываў надзвычай вялікая; вытворчая практыка з'яўляецца тым звяном, якое звязвае тэарэтычныя курсы методыкі работы з дзіцячым калектывам і рэальную практыку, дапамагае рыхтаваць спецыялістаў у сферы духавога мастацтва.

На сучасным этапе, накіраваным на паглыбленне прафесійнай падрыхтоўкі студэнтаў, набыццё практычных навыкаў і ўменняў, неабходных для будучай прафесіі, вытворчая практыка студэнтаў II — V курсаў на кафедры духавой музыкі з'яўляецца комплекснай і праходзіць на працягу ўсяго працэсу навучання.

Арганізацыйная мадэль вытворчай практыкі, якая ўсталявалася на кафедры, уключае некалькі этапаў. Кожны этап пачынаецца з установачнай канферэнцыі, дзе адбываецца



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

знаёмства з адміністрацыяй базы практыкі, кіраўнікамі творчых калектываў. Вызначаецца праграма дзейнасці практыкантаў. Студэнты атрымліваюць уяўленні пра задачы, змест практыкі, арганізацыю, правядзенне кансультавання, падрыхтоўкі справаздачнай дакументацыі, крытэрыі ацэнкі практыкі.

Вытворчая практыка на спецыялізацыі праводзіцца ў IV, V, VI, VII, IX семестрах адначасова з пачаткам вывучэння спецыяльных дысцыплін.Удакладненне зместу кожнага этапу практыкі — адзін з накірункаў даследавання мастацка-творчай падрыхтоўкі студэнтаў. Так на I этапе (IV семестр) праводзяцца ў лютым — установачная канферэнцыя; лютым — маі — азнаямляльная практыка без адрыву ад навучальнага працэсу (16 тыдняў); маі — кантрольны ўрок.

У гэты перыяд студэнты прыступаюць да вывучэння прагрэсіўных методык. На працягу першых чатырох тыдняў яны разам з кіраўніком практыкі (выкладчыкам кафедры) наведваюць рэпетыцыі і канцэрты лепшых аматарскіх і прафесійных калектываў г.Мінска з мэтай азнаямлення з іх разнастайнай выканальніцкай дзейнасцю. Пасля гэтага падгрупа студэнтаў у колькасці 3—4-х чалавек размяркоўваецца для далейшага праходжання практыкі ў адзін з калектываў.

Практыка праводзіцца адзін раз у тыдзень па дзве гадзіны ў вольны ад вучобы час.

У ходзе азнаямленчай практыкі студэнты знаёмяцца са зместам дзейнасці кіраўніка творчага калектыву, засвойваюць формы і метады арганізацыйнай, вучэбна-выхаваўчай і творчай работы базавага калектыву практыкі, прынцыпы фарміравання рэпертуару, прымаюць практычны ўдзел у якасці выканаўцы (інструменталіста), засвойваюць на практыцы веды, атрыманыя па агульнаадукацыйных і спецыяльных дысцыплінах "Аркестравы клас", "Інструментазнаўства", "Камерна-інструментальны ансамбль".

На II этапе практыкі (V — VI семестры) у кастрычніку

праходзіць установачная сесія; у кастрычніку — снежні — вучэбная практыка без адрыву ад навучальнага працэсу (12 тыдняў); у лютым — маі — таксама вучэбная практыка без адрыву ад навучальнага працэсу (16 тыдняў). У маі студэнты здаюць залік.

У гэты перыяд практыканты ў скдадзе падгрупы з 3—4-х чалавек наведваюць заняткі аднаго з самадзейных або прафесійных мастацкіх калектываў (адзін раз у тыдзень на дзве гадзіны ў вольны ад вучобы час). Асноўным відам дзейнасці студэнтаў з'яўляецца практычны ўдзел у рабоце калектыву ў якасці выканаўцы. Кожны студэнт авалодвае ў час практыкі навыкамі выканальніцкай работы.

У ходзе вучэбнай практыкі студэнты вывучаюць і аналізуюць планы вучэбна-выхаваўчай работы, набываюць практычныя ўменні па аранжыроўцы, інструментоўцы, удасканаленні ігры на аркестравых інструментах. Па жаданні практыканты ствараюць для базавага калектыву па адной самастойнай творчай рабоце (інструментоўка, аранжыроўка), дапамагаюць кіраўніку калектыву ў падрыхтоўцы нотнага матэрыялу ў адпаведнасці з рэпертуарным планам, набываюць самастойныя навыкі правядзення індывідуальных і групавых заняткаў. Студэнты выкарыстоўваюць веды, атрыманыя ў працэсе вывучэння агульнаадукацыйных дысцыплін, педагогікі і псіхалогіі, а таксама комплексныя веды па спецыяльных дысцыплінах "Вывучэнне аркестравых інструментаў", "Інструментоўка", "Спецінструмент" для ўдасканалення прафесійных уменняў і навыкаў, здольных забяспечыць эфектыўнае засваенне будучай прафесіі.

Заняткі III этапу (VII семестр) наступныя: верасень — установачная канферэнцыя; кастрычнік — вытворчая практыка з адрывам ад навучальнага працэсу (4 тыдні); лістапад — абарона вытворчай практыкі.

Дадзеная практыка характарызуецца тым, што студэнты ўпершыню набываюць навыкі самастойнай работы з мастацкім калектывам у якасці дырыжора, спасцігаюць

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

асаблівасці дзейнасці кіраўнікоў творчых калектываў, метадычных службаў па ўдасканаленні функцыяніравання калектываў розных накірункаў і жанраў.

На гэтым этапе практыканты вывучаюць прынцыпы падбору вучэбнага канцэртнага рэпертуару, планавання і арганізацыі вучэбна-выхаваўчай работы, набываюць навыкі самастойнай працы з мастацкім калектывам. У ходзе вытворчай практыкі студэнты працуюць над удасканаленнем практычных навыкаў планавання і ажыццяўлення менеджэрскай і метадычнай дзейнасці мастацкіх калектываў, вырашаюць пытанні рэкламнага, фінансавага і матэрыяльна-тэхнічнага забеспячэння мастацкай дзейнасці, таксама набываюць навыкі карыстання існуючымі заканадаўчымі актамі, якаснага складання неабходнай службовай дакументацыі.

Мэтай вытворчай практыкі з'яўляецца паглыбленне, замацаванне і творчае выкарыстанне ведаў, атрыманых студэнтамі на спецыяльных курсах ("Дырыжыраванне", "Методыка работы з аркестрам і ансамблем духавых інструментаў", "Чытка аркестравых партытур", "Інструментоўка", "Гісторыя нацыянальнага і сусветнага выкладання на духавых інструментах"), а таксама пашырэнне практычных уменняў, набытых у час ранейшай практыкі.

Расклад заняткаў IV этапу (IX семестр) такі: верасень — установачная канферэнцыя; кастрычнік — лістапад — пераддыпломная практыка з адрывам ад навучальнага працэсу (8 тыдняў); снежань — выніковая абарона пераддыпломнай практыкі.

Пераддыпломная практыка з'яўляецца заключным звяном комплекснай вытворчай практыкі студэнтаў кафедры духавой музыкі. На гэтым этапе практыканты выконваюць функцыі кіраўніка, інструментоўшчыка і аранжыроўшчыка, рыхтуюць да канцэртнага выступлення па дзве самастойна зробленыя інструментоўкі, а таксама два творы з рэперту-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ару калектыву, на базе якога яны праходзілі практыку. У час практыкі студэнты праводзяць індывідуальныя і дробнагрупавыя заняткі, настройваюць інструменты, перапісваюць партыі і партытуры, а таксама ўдзельнічаюць у канцэртнай дзейнасці базавых калектываў у якасці выканаўцаў.

У ходзе пераддыпломнай практыкі студэнты знаёмяцца з работай мастацкага калектыву (упраўленчы, рэпетыцыйны працэс, арганізацыйна-фінансавая і матэрыяльна-тэхнічная дзейнасць), вывучаюць пытанні эканамічнага забеспячэння гастрольнай дзейнасці калектываў, асаблівасці дзейнасці менеджэра, менеджмента і напрамкі іх функцый у сучасных умовах (прадзюсер, пастаноўшчык, сцэнарыст, імпрэсарыо), а таксама з творчымі сувязямі калектыву ўнутры краіны і за мяжой.

Выніковая — творчая пераддыпломная практыка дае магчымасць студэнтам самастойна выкарыстаць у практычнай дзейнасці сістэму ведаў па курсах "Жанрава-стылявыя асаблівасці выканання сучаснай і беларускай музыкі", "Методыка выкладання дырыжыравання", "Методыка навучання ігры на духавых інструментах", атрыманых у аўдыторных умовах праверыць прафесійную годнасць да арганізацыі творчай і вучэбна-выхаваўчай работы ў мастацкім калектыве; навучыцца абгрунтоўваць мэтазгоднасць мастацкіх праектаў, якія забяспечваюць маральна-эстэтычнае развіццё грамадства і даюць эканамічны эфект.

Такім чынам, разгледжаныя пытанні па асноўных формах, відах і змесце практыкі, аналізе і вопыце работы на кафедры духавой музыкі Беларускага універсітэта культуры дазваляюць канстатаваць, што менавіта вытворчая практыка — гэта галоўная ўмова падрыхтоўкі спецыялістаў духавога мастацтва, якая не можа падмяніць вывучэння студэнтамі прафілюючых дысцыплін па спецыялізацыі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ